**Альшэўская, Т.** Падзяка Прэзідэнта Валянціну Андрыеўскаму / Т. Альшэўская // Родныя вытокі (Докшыцы). — 2020. — 28 лістап. — С. 1.

# ПАДЗЯКА ПРЭЗІДЭНТА ВАЛЯНЦІНУ АНДРЫЕЎСКАМУ



**У Палацы Рэспублікі прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка 25 лістапада ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды амаль 40 прадстаўнікам розных сфер. «Цырымонія ўручэння дзяржаўных узнагарод – гэта выдатная магчымасць па заслугах адзначыць дасягненні людзей, якія заслугоўваюць таго, каб пра іх ведала ўся краіна, сардэчна падзякаваць за самаадданую працу, талент і прафесійнае майстэрства», – падкрэсліў прэм'ер-міністр. Дзяржаўных узнагарод удастоены прадстаўнікі навукі, адукацыі, сферы сацыяльнай абароны, будаўнічай галіны, грамадскіх аб'яднанняў. Сярод іх і старшыня Докшыцкай раённай арганізацыі ГА «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» Валянцін Андрыеўскі. Валянцін Станіслававіч за шматгадовую, плённую грамадскую дзейнасць, значны асабісты ўклад у развіццё ветэранскага руху воінаў-інтэрнацыяналістаў атрымаў Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а таксама імянны гадзіннік.**

Такія людзі, як Валянцін Андрыеўскі, – гэта своеасаблівыя рухавікі жыцця. Без іх энергетыкі, высокага пачуцця грамадзянскасці, адказнасці за даручаную справу многае так і не пабачыла б свет. Ужо 16 гадоў былы старшы сяржант 357 гвардзейскага парашутна-дэсантнага палка ўзначальвае раённую суполку ветэранаў-афганцаў. За гэты час на яго рахунку значыцца безліч спраў, з якіх любая сведчыць пра неардынарнасць гэтага чалавека як грамадскага дзеяча. Дзякуючы яго намаганням наш горад ганарыцца паркам воінскай славы, у якім эскіз помніка, дарэчы, стварыў сам Валянцін, а баявая машына дэсанта – гэта тое месца, дзе нашы хлопчыкі пачынаюць знаёмства з арміяй. Кожны год 15 лютага былыя воіны-інтэрнацыяналісты збіраюцца на ўрачыстасць, у час якой грамадскасць аддае даніну павагі салдатам, што годна выканалі свой воінскі доўг. І няхай ваявалі яны не за тэрытарыяльную цэльнасць краіны, як іх бацькі і дзяды, затое за яе інтарэсы. А напярэдадні гэтай падзеі ўжо шмат гадоў запар «галоўны афганец» раёна са сваімі сябрамі абавязкова сустракаецца са школьнікамі. І глядзяць шырока раскрытымі вачамі хлопчыкі–падлеткі на дзядуляў, якія некалі станавіліся мужчынамі, адбіваючы начныя вылазкі «духаў», губляючы сяброў, якім узнагароды давалі за асабістую мужнасць. Ордэн Чырвонай Зоркі мае і Валянцін Станіслававіч. Два разы кантужанаму, яму ўсё ж такі пашчасціла вярнуцца дадому жывым, і ён, адправіўшы «грузам 200» не аднаго аднапалчаніна, даў клятву памятаць пра іх заўсёды і зрабіць усё магчымае, каб памяталі іншыя.

Для сваіх сённяшніх воінаў-інтэрнацыяналістаў ён як бацька родны. Ведае, чым і як жыве кожны: радуецца вяселлям дзяцей, нараджэнням унукаў, праводзіць у апошні шлях. Іх афганскаму братэрству можна пазайздросціць і выказаць словы захаплення, што аднаму чалавеку так шмат аказалася пад сілу. Будзе няшчыра не ўспомніць у артыкуле пра сапраўдную «баявую», калі так можна выказацца, сяброўку Валянціна Станіслававіча, з якой у шчаслівым шлюбе ён ужо сорак гадоў. Святлана Упадзіміраўна не толькі працуе разам з мужам на «хуткай дапамозе» – яна побач з ім заўсёды: дапамагае, раіць, падтрымлівае. І, трымаючы слова на сцэне на чарговым свяце, ён абавязкова шукае вачамі ў зале родны твар з цёплай усмешкай. Нават самаму смеламу салдату патрэбны надзейны тыл.

З узнагародай, Валянцін Станіслававіч! Здароўя Вам, душэўнай моцы і нязгаснага жадання рабіць дабро.

**Тамара АЛЬШЭЎСКАЯ**